# РОЛЯ І ЗНАЧЭННЕ ШТУЧНАГА ІНТЭЛЕКТУ Ў АДУКАЦЫІ: ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

**А. А. Хадакова**

*Беларускі дзяржауны універсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, hodakova@bsu.by*

Артыкул прысвечаны штучнаму інтэлекту ў сферы адукацыі. Вызначаецца тэрмін «штучны інтэлект». Абазначаюцца яго рысы. Устанаўліваюцца этапы развіцця ўзаемадзеяння ў адпаведнасці са статусам краіны пры арганізацыі. Разглядаюцца напрамкі развіцця штучнага інтэлекту, а таксама ўказваецца на яго добрыя якасці і недахопы. Аналізуюцца праблемныя аспекты выкарстання штучнага інтэлекту ў адукацыі. Аўтарам прапануюцца направмкі развіцця штучнага інтэлекту і выкарыстанні яго як выкладчыкам так і магчымасць прымяненні яго ў аптымальных аб'ёмах для студэнтаў.

***Ключавые словы:*** штучны інтэлект; адукацыя; ціфравізацыя; лічбавыя тэхналогіі.

# THE ROLE AND SIGNIFICANCE OF ARTIFICIAL INTELLIGENCE IN EDUCATION: DEVELOPMENT PROSPECTS

**A. A. Khadakova**

*Belarusian State University, 4.*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, hodakova@bsu.by*

The article is devoted to artificial intelligence in the field of education. The term artificial intelligence is defined. Its features are indicated. The stages of development of interaction are established in accordance with the status of the country in the organization. The directions of development of artificial intelligence are considered, and its good qualities and shortcomings are also indicated. The problematic aspects of the use of artificial intelligence in education are analyzed. The authors propose directions of development of artificial intelligence and its use both by teachers and the possibility of its application in optimal volumes for students.

***Keywords:*** artificial intelligence; education; digitization; digital technologies.

Сучасны этап развіцця грамадства і дзяржавы характарызуецца ўкараненнем лічбавых тэхналогій, якія даюць штрушок у тым ліку і да мадэрнізацыі адукацыйных працэсаў. Адным з ключавых тэхналагічных і практычных вектараў, якія актыўна ўкараняюцца ў сферы адукацыі, з'яўляецца інтэлект. Штучны інтэллект дае значныя магчымасці пры вырашэнні задач у розных сферах. Аднак уяўляецца, што існуюць некаторыя праблемныя аспекты, звязанныя з яго выкарыстаннем у адукацыйным працэсе і асяродзі. У сувязі з гэтым тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў штучным інтэлекце патрабуюць пастаяннага і сістэматычнага ўдасканалення [1].

Штучны інтэлект выглядае як тэхналогія, мэтай якой з’яўляецца забеспячэнне тэхнікі, у тым ліку рабатызаванай, аналітычнай сістэмай разумна думаць, таксама як чалавек.

З сярэдзіны 1950-х гг. былі распаўсюджаны вылічальныя машыны, якія выконвалі некалькі пастаўленных дзеянняў адначасова. У гэты ж перыяд пачынаюць з’яўляцца даследванні ў вобласці штучнага інтэлекту. Яны праводзіліся праз вывучэнне інтэлекту чалавека, пасля чаго атрыманыя вынікі прымяняліся да дзейнасці камп’ютэраў. Інфармацыя для даследаванняў па штучным інтэлекце бярэцца з розных крыніц і дысцыплін такіх як матэматыка, інфарматыка, псіхалогія, лінгвістыка, машынабудаванне і інш. Такім чынам з дапамогай тэхналогій машыннага навучання камп’ютэры імкнуцца пераймаць тыя дзеянні, якія выконвае чалавек [2].

Аднака калі падыходзіць крытычна, то аднымі з актуальных пытанняў якія вывучаюцца сучаснымі даследчыкамі становяцца тыя, якія прысвечаныя тэме цыфравізацыі і ўжыванню лічбавых тэхналогій адукацыйнага працэсу. І натуральна вялікае ўвага надаецца магчымасцям штучнага інтэлекту і прымяненні яго ў адукацыі. Яго выкарыстанне патэнцыйна можа прывесці да паляпшэння якасці навучання праз аўтаматызацыю працэсу аналізу навучальных даных. Але узнікаюць пытанні аб дакладнасці паказчыкаў і ацэнцы іх эфектыўнасці. У сувязі з гэтым, з’яўляецца важным распрацоўка надзейных і справядлівых методык ацэнкі і зваротнай сувязі пры выкарыстанні штучнага інтэлекту ў адукацыі. У той жа час, штучны інтэлект дазволіць ствараць больш дасканалыя навучальныя праграмы, якія будуць адаптавацца да індывідуальных патрэб устаноў адукацыі і кожнага студэнта (навучэнца) паасобку. Гэта будзе садзейнічать найбольш эфектыунаму навучанню і паляпшэнню паспяховасці. Яшчэ адным станоўчым аспектам выкарыстання штучнага інтэлекту з’яўляецца тое, што з дапамогай яго можна ствараць дастаткова цікавы і інтэрактыўны навучальны кантэнт. Віртуальныя кейсы, навучальныя гульні і адаптыўныя навучальныя матэрыялы дапамогуць зрабіць навучанне больш прываблівым і эфектыўным [3].

Такім чынам, на наш погляд, выкарыстанне штучнага інтэлекту ў адукацыі будзе карысным і перспектыўным для яго развіцця. Уяўляецца, што аднымі з напрамкаў яго ўдасканалення ў сферы адукацыі будуць наступныя.

1. Штучны інтэлект зможа дазволіць студэнту самастойна падабраць неабходную літаратуру па тэме навуковага даследавання зыходзячы з яго навуковых інтарэсаў.

2. Штучны інтэлект з’яуляецца больш эфектыўным для хуткай і якаснай праверкі засвоеных ведаў, што спрашчае працэс іх ацэньвання для выкладчыка.

3. Бачыцца, што штучны інтэлект неабходны для магчымасці сістэматызацыі інфармацыі, дапамогі ў распрацоўцы прэзентацый як студэнтамі так і выкладчыкамі ў частцы выкарыстання шаблонаў, лічбавых эфектаў і т. д.

4. Штучны інтэлект дазволіць укараніць сістэму, якая дазваляе адсачыць спробы несанкцыянаванага карыстання студэнтаў (навучэнцаў) на кантрольных, праверачных, тэстах і іспытах.

У сістэме штучнага інтэлекту маюцца на наш погляд і свае недахопы. Па-першае, дадзеная сістэма не заўсёды тэхнічна дасканалая і дакладная, у часцы вырашэння той ці іншай задачы з хібнасцю. Больш за тое, на наш погляд, выкладчыкам у вышэйшай школе неабходна выкарыстоўвать гэтыя тэхналогіі, каб палепшіць адукацыйны працэс і патрабаваць у студэнтаў (навучэнцаў) выконваць розныя кейсы, выдадзеные ім у якасці хатняга задання [3].

Такім чынам, штучны інтэлект дазволіць, на нашу думку вырашаць пэўныя адукацыйныя задачы творча, павышаць сваю педагагічную і тэхналагічную кампетэнтнасць, каб ствараць адпаведныя ўмовы навучання, якія даюць магчымасць максімальна эфектыўна выкарыстоўваць тыя перавагі, якія дае штучны інтэлект.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Калинушкина, Е. С. Искусственный интеллект в образовании / Е. С. Калинушкина, В. А. Калинушкин // Молодой ученый. — 2023. — № 44 (491). — С. 95—97.

2. Захаров, А. Искусственный интеллект / А. Захаров // Платформа омниканального маркетинга. — 14.04.2023 — URL: https://www.calltouch.ru/glossary/iskusstvennyy-intellekt (дата обращения: 09.09.2024).

3. Ткаченко, А. М. Искусственный интеллект, возможности и ограничения его использования в образовании / А. М. Ткаченко // Путеводитель предпринимателя. — 2023. — Т. 16, № 3. — С. 57 —62. — URL: https://www.pp-mag.ru/jour/article/view/1751 (дата обращения: 09.09.2024)